Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Даўгінаўская сярэдняя школа
імя У.І.Слабодчыкава ”

# *Вывучэнне культурнай спадчыны роднага краю на вучэбных занятках для дзяцей з АПФР*

Настаўнік-дэфектолаг:
Н.А.Цимашчук

## Вывучэнне культурнай спадчыны роднага краю на вучэбных занятках для дзяцей з АПФР

Адным са сродкаў актывізацыі пазнаваўчай актыўнасці вучняў з АПФР на ўроках і ў пазакласнай рабоце з'яўляецца выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу. Вывучэнне культурнай спадчыны на прыкладзе канкрэтнай мясцовасці адыгрывае вялікую адукацыйную ролю. Краязнаўства дапамагае дзецям адчуць сябе сапраўднымі грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Сістэмнае выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу актывізуе пазнавальныя, пошукавыя і даследчыя ўменні вучняў, фарміруе іх грамадзянскую пазіцыю, каштоўнасна-светапоглядныя адносіны да культуры, мовы, гісторыі і народа.

Пры падрыхтоўцы да ўрокаў, у адпаведнасці з вучэбнай праграмай, узроставымі і псіхалагічнымі асаблівасцям школьнікаў, я стараюся па магчымасці ўключыць ў іх змест гісторыка-краязнаўчыя матэрыялы, якія маюцца ў школьным краязнаўчым музеі. Экскурсіі ў ім знаёмяць з гісторыяй развіцця вёскі, этнаграфічнай спадчынай продкаў, удзелам землякоў у грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнах і інш.

На уроках літаратурнага чытання стараюся адкрыць для навучэнцаў прыгажосць бачання свету праз пачуццё любові да Радзімы, яе прыроды, яе народа. Любоў да Бацькаўшчыны, сапраўдная, шчырая, моцная, змяняе душу чалавека.

Мінаюць гады, прабягаюць стагоддзі, але нязменным застаецца адно – мудрасць людскіх пакаленняў, якія жылі на нашай зямлі. Гэта наш скарб, наша бясцэнная каштоўнасць. Гісторыя – гэта змена пакаленняў. Што пакінем нашчадкам? Ці зможам захаваць і беражліва перадаць лепшае, што ёсць у нас? Што ёсць для нас наша мова? Гэта, вядома ж, беларускі фальклор.

Фальклор – гэта шматвекавы пласт культуры, з якім неразрыўна звязана гісторыя нашага народа. У яго аснове закладзены вялікі выхаваўчы патэнцыял, спасобны садзейнічаць гарманічнаму развіццю асобы, фарміраванню сістэмы каштоўнасцей. Гэта чароўныя казкі, пачутыя ў маленстве, матчыны калыханкі, бабуліны песні, беларускія абрады і бацькаўская зямля, дзе кожны ўзгорачак і кветачка маюць сваю непаўторную назву, ад якой шчыміць у замілаванні сэрца. Да ўсяго гэтага, а таксама да творчасці беларускіх аўтараў стараюся прывіць пачуццё любові і

замілаванасці. Кожны літаратурны твор нас чаму-небудзь вучыць, выхоўвае розныя пачуцці, таму на ўроках чытання я стараюся шмат увагі ўдзяляць выхаванню асобы вучня, аналізуючы ўчынкі літаратурных герояў.

Набыць новыя веды ў цікавай і займальнай форме дазваляюць экскурсіі ў прыроду, праведзеныя на ўроках чалавек і свет. Падчас экскурсій па родным краі дзеці вучацца мысліць, ацэньваць, а потым і прымяняць на практыцы атрыманыя веды.

Прырода – гэта невычэрпная крыніца творчасці, праз якую праяўляецца любоў да роднага краю. Удумлівае вывучэнне роднай прыроды задавальняе інтарэсы навучэнцаў, бо прырода змяняецца – яна розная летам, восенню, зімой, вясной. Вось чаму назіранне за ёй – гэта важны элемент патрыятычнага выхавання. Кажуць, што свет прыроды фарміруе душу чалавека, адметнасць яго нацыянальнага характару. І з гэтым, відаць, трэба пагадзіцца. Душа нашага народа спакойная, лагодная, мудрая, ціхая, як і наша прырода.

Важнай часткай вывучэння культурнай спадчыны з'яўляецца грамадска-карысная дзейнасць: добраўпарадкаванне тэрыторый ля помнікаў воінам-землякам, загінуўшым угады Вялікай Айчыннай вайны; помнікаў загінуўшым у гады вайды яўрэям, капліц на месцы пахаванняў воінаў, якія загінулі ў гады Першай Сусветнай вайны.

Наша родная беларуская мова такая чыстая, узнёслая і велічная. Як мала мы, беларусы, ведаем і любім сваю мову і сябе. Зараз востра стаіць пытанне захаваць беларускую культуру і мову. Таму узнікла неабходнасць мэтанакіраванай працы па фарміраванні нацыянальнай свядомасці ў навучэнцаў праз вывучэнне нацыянальнуай культуры як фундаментальнай духоўнай каштоўнасці народа. На ўроках беларускай мовы я стараюся вучыць размаўляць па беларуску, фарміраваць уменне думаць і будаваць звязнае выказванне на беларускай мове, называць навакольныя прадметы па беларуску.

Нацыянальная свядомасць і гонар за свой край фарміруецца ў сям'і. Мы разумеем, што любоў і павага да Бацькаўшчыны пачынаюцца менавіта з любві да бацькі і маці, да сваёй сям'і, да месца нараджэння і жыхарства. Любіць свой "родны кут" – адсюль пачынаецца асабістае далучэнне да вялікай Радзімы і разуменне таго, што ты – яе грамадзянін.

Веданне гісторыі свайго краю дазваляе па-новаму асэнсаваць мінулае, сучаснае і ўявіць будучае, сфарміраваць неабходныя каштоўнасныя арыенціры. Таму выхаванне грамадзяніна, патрыёта неабходна ажыццяўляць праз вывучэнне сваіх каранёў і сваіх вытокаў, праз вывучэнне спадчыны свайго краю. І педагогу, як нікому другому, ў век цывілізацыі, трэба выконваць самую адказную місію на Зямлі – далучаць сваіх выхаванцаў да прыгажосці роднай мовы, культуры, выхоўваць павагу да гісторыі, традыцый і звычаяў роднага краю.

Каб пераадолець сацыяльную абыякавасць і выхаваць у навучэнцаў любоў да Радзімы, грамадзянскую адказнасць за дзяржаву педагогам трэба пачынаць патрыятычнае выхаванне з сябе, са свайго ўласнага патрыятызму, бо ніякія інавацыі і сучасныя методыкі не здольныя замяніць асабістага прыкладу выкладчыка-патрыёта і грамадзяніна, які добра ведае культурную спадчыну свайго краю. " У чалавека, які дажыў да глыбокай старасці, спыталі, які самы галоўны ўрок ён вынес са свайго жыцця. Той адказаў, што калі быў малады, дык хацеў змяніць увесь свет, але гэта ў яго не атрымалася. Калі пасталеў, пачаў змяняць сваіх сяброў, але і гэта было марнай справай. І толькі на прыканцы свайго жыцця зразумеў, што змяняць трэба было з юначых гадоў самога сябе” (прытча). Вось чаму важна змяняць сябе, быць прыкладам самаахвярнага служэння Радзіме, самому вывучаць гісторыю і культурную спадчыну роднага краю, каб потым вучыць усяму гэтаму дзетак, у тым ліку і дзетак з АПФР, якія баццам губка ўсмоктваюць усё тое, што ім скажаш і чаму іх навучыш…